# КІРАЎНІКУ І ОРГАНІЗАТАРУ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА БССР, БЯЗЬЛІТАСНАМУ БАРАЦЬБІТУ ЗА ЧЫСТАТУ ЛЕНІНСКАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ—XIII ЗЬЕЗДУ БАЛЬШАВІЦКАЙ ГВАРДЫІ БЕЛАРУСІ І ЯЕ ЛЕНІНСКАМУ ЦК—ПАЛКАЕ КОМСАМОЛЬСКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ

**Да XIII зьезду КП(б)Б**

## Выпрабаваная ў барацьбе з правым опортунізмам, перамагаючы „левыя“ загібы, пад ленінскім сьцягам адзінства, маналітнымі калёнамі з вялікімі посьпехамі—КП(б)Б прышла да свайго XIII зьезду

Сёньня адчыняецца XIII-ы Зьезд КП(б)Б. Партыя прыходзіць да зьезду са значнымі посьпехамі. Валавая прадукцыя прамысловасьці за першае паўгодзьдзе 1929-30 г. узрасла на 72,1 проц. Капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьць узрасьлі ўдвое. Гэта сьведчыць аб няўхільным выкананьні задач індустрыялізацыі, ажыцьцяўляемай шпаркімі тэмпамі. У галіне сельскае гаспадаркі мы маем масавы рух бедняцка-серадняцкіх колаў вёскі ў калгасы. Сацыялістычная перабудова сельскае гаспадаркі значна прасунулася ўперад.

Маюцца і недахопы ў рабоце: прамысловасьць адстае ў справе зьніжэньня сабекошту, якасьць прадукцыі, застаецца нізкай. Прафэсыянальныя саюзы не перабудавалі сваёй работы, не паварнуліся «тварам да вытворчасьці» і недастаткова ахапілі той уздым актыўнасьці рабочае клясы, які ў асноўным забясьпечыў посьпехі нашага прамысловага разьвіцьця.

Пры правядзеньні калектывізацыі мы прашлі праз паласу «галавакружэньне ад посьпехаў», мы мелі шэраг перагібаў і скрыўленьняў партыйнай лініі, і толькі рашучае іх выпраўленьне і барацьба за ажыцьцяўленьне ленінскіх прынцыпаў дабраахвотнасьці ў калгасным руху, забясьпечылі далейшае узмацненьне і разгортваньне калгаснага будаўніцтва.

У барацьбе з усялякага роду ухіламі ад генэральнай лініі—партыя таксама дабілася значных посьпехаў. Разьбіўшы на галаву контррэвалюцыйны троцкізм, партыя нанесла руйнуючы удар па праваму ўхілу—галоўнай небясьпецы на данным этапе. Пасьпяховая барацьба з ««прымірэнцкай» сьведчыць аб тым, што барацьба з правым ухілам вялася пасьлядоўна ў тэорыі і на практыцы. Партыя рашуча змагалася з нацыянал-дэмакратызмам і нацыянал опартунізмам падвёўшы пад бальшавіцкую крытыку народніцкія дробнабуржуазныя тэорыі, насіцелі якіх разам з правымі опартуністымі стараліся павярнуць партыю на шлях разьвіцьця капіталістычных элемэнтаў у краіне. Дасягненьні партыі ў галіне соцыялістычнага будаўніцтва узмацнілі рост прамысловага пролетарыяту і склалі ў вёсцы моцнае колгаснае ядро.

Такім чынам, агульныя вынікі работы КП(б)Б за мінулы пэрыяд сьведчаць аб няўхільным выкананьні асноўных задач партыі і вялікай работы, праробленай ёю ва ўмовах абвастраючайся клясавай барацьбы. Задача XIII-га партыйнага Зьезду будзе, аднак, заключаюцца ня толькі ў ацэнцы дасягненьняў і ўстаноўленьні недахопаў. Галоўная задача зьезду заключаюцца ў тым, каб вызначыць шляхі далейшай работы. Першае, што неабходна прыняць пры гэтым пад увагу, узмацненьне права-опортуністычнай небясьпекі. Старая плятформа правых дастаткова дыскрэдытавана ў шэрагах партыі. Правы опортунізм праяўляецца зараз ў новых формах, часта старанна маскуючы свой твар. У першую чаргу правыя опортуністы робяць спробы дыскрэдытаваць партыйнае кіраўніцтва. Гэтыя спробы выражаюцца ў імкненьні тлумачыць ўсе перагібы і скрыўленьні лініі партыі памылкамі кіруючых цэнтраў партыі, апранаючыся часам у форму бяспрынцыпнай дэмагогіі. Правыя опортуністы імкнуцца змазаць, зацямніць асноўны лёзунг партыі аб ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі. У калгасным руху яны прапаведваюць тэорыю «самацёку», распаўсюджваюць панічныя чуткі аб «адступленьні», адмаўляючыся у практычнай рабоце падтрымаць і разьвіваць будаўніцтва колгасаў. У гэтых новых формах ня цяжка пазнаць знаёмыя установкі на разьвіцьцё капіталістычных элемэнтаў у вёсцы. У пытаньнях індустрыялізацыі краіны правыя опартуністыя, як і раней прапануюць раўненьне на «вузкія месцы», імкнуцца пад заслонай «дзелавых» довадаў і дзеляцкіх размаўленьняў аслабіць тэмпы індустрыялізацыі.

Недаацэнка работы з беднатой, адмахваньне ад гэтай работы зьяўляецца таксама характэрнай рыскай правага опортунізму.

Асаблівасьцю правай небясьпекі ў даны момант зьяўляецца цеснае перапляценьне яе з «левымі» ухіленьнямі ад партыйнай лініі. Узаемаадносіны правага ўхілу і «левых» загібаў заключаюцца зараз ня толькі ў тым, што «левыя» загібы хаваюць правую небясьпеку, узмацняючы права-опортуністычныя тэндэнцыі і даючы лішні аргумент у рукі правых опортуністых: правыя і левыя ухіленьні пераплятаюцца часамі самым дзівосным чынам, аб'ядноўваючыся там, дзе гутарка ідзе аб удары па партыйнаму кіраўніцтву. Вельмі часта ў такім пытаньні, як пытаньне аб рабоце з вясковай беднатой, «левыя» загібшчыкі выказваюць тую-ж самую недаацэнку і адмахваньне ад гэтай работы, якое прысутна правым ухілістам.

Для ўсіх відаў опортунізму характэрным зьяўляецца расплывістасьць, нявызначанасьць, схільнасьць да агаворак, уступак і кампрамісаў. Маскуючыся фармальным прызнаньнем гэнеральнай лініі партыі, маскуючыся прызнаньнем асноўных лёзунгаў партыі, опартуністыя імкнуцца працягнуць свае ідэі ў відзе розных агаворачак, папраўчак і заўваг.

Барацьба з новымі формамі праяўленьня правага ўхілу, які застаецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, і з «левымі» загібамі патрабуе ад партыйнага кіраўніцтва пасьлядоўнасьці, чоткасьці, яснасьці у формуліроўках задач, якія стаяць перад організацыяй. «Калі абвяшчаецца вайна праваму ухілу—піша тав. Сталін—правыя ухілістыя звычайна перакрашваюцца ў прымірэнцаў і ставяць партыю ў цяжкае становішча». Прымірэнцкія ад-

З поўным тэкстам дакумента
можна азнаёміцца ў бібліятэцы